УДК 882.6

А.С. Емяльянаў

# Прырода і поры года ў паэзіі Я. Коласа для дзяцей

Прырода для Я. Коласа – невычарпальная крыніца фантазіі, летуцення, сімвал прыгожага, высакароднага, паэтычнага. Сам зведаўшы ў дзяцінстве яе цудадзейнае маральна-эстэтычнае жыватворнае ўздзеянне, ён імкнуўся навучыць маленькіх чытачоў эстэтычнаму ўспрыманню роднай прыроды. Як вядома, у пісьме да С.А. Вянгерава ад 24 лютага 1913 г. Я. Колас пісаў: «Жили мы одиноко, и детство моё прошло в одиночестве. Картины окружающей природы были очень просты и незатейливы, но тем не менее они сильно действовали на меня и глубоко западали в душу. Мне особенно нравилось пение жаворонков... Я так изучил оттенки песен жаворонков, что сразу находил разницу в пении жаворонков нашей местности от песен других жаворонков» [1].

І не выпадкова паэзія Я. Коласа дзівосна ўвабрала ў сябе гукі, фарбы, колеры, пахі, настроі, найтанчэйшыя нюансы роднай прыроды, якія зніталіся з пачуццямі, думкамі, учынкамі, адчуваннямі, паняццямі канкрэтнай асобы. Літаральна ўсюды – дзе прама, дзе падтэкстна, але заўсёды дакладна і даходліва – акцэнтуецца ўвага на грамадзянскіх, гуманных узаемаадносінах, адзінстве прыроды і чалавека. Для Коласа прырода – сімвал прыгожага, дасканалага, высакароднага – істота высокамаральная. Паказальна ў гэтых адносінах паэма «Сымон-Музыка», прысвечаная беларускай моладзі. У ёй, як ні ў якім іншым творы Коласа ды і ўвогуле ўсёй беларускай літаратуры, адлюстравана музыкальна-філасофскае ўспрыманне прыроды.

У самабытным мастацкім уяўленні паэта прырода паўстае роднай сястрой дзіцяці – самай шчырай, непасрэднай, справядлівай істоты, бо і сама з'яўляецца такой. Услухаемся ў апісанне прарастання жыта ў паэме «Новая зямля»:

На божы свет, як бы з магілы,
З зямлі травінкай далікатнай,
Густою шчотачкаю здатна
Выходзяць дробныя зярняткі.
Як у калысачцы дзіцятка,
Калі ўжо трошкі акрыяе,
Сваю галоўку падымае
І навакол глядзіць здзіўлёна, –
Так гэта збожжайка зялёна
Да сонца цягнецца лісткамі,
Бы к матцы дзіцятка рукамі.
[1, т. 6, с. 34]

Наогул прырода ў Коласа надзелена ўсімі чалавечымі якасцямі, і размаўляе ён з ёю як з істотай, што ўмее думаць, разважаць, смяяцца, весяліцца, смуткаваць:

Ідзі, зіма, ідзі ў дарогу:
Прайшоў твой час, дзякаваць богу!
Пабач, старая: там, у полі,
Чарнеюць леташнія ролі!
А ўзгоркі, вунь, паразумнелі,
Бо вельмі значна палыселі.

А лес, глядзі, які вясёлы!
І дуб смяецца, хоць і голы...
[1, т. 6, с. 182-183]

У паэме «Новая зямля», якую справядліва называюць энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства канца XIX – пачатку XX стагоддзяў, пераканальна паказана велізарная роля жывой і нежывой прыроды ў гарманічным фарміраванні духоўнага свету чалавека з самых ранніх, дзіцячых гадоў. І заканамерна, што многія раздзелы твора чыста «дзіцячыя» («Дзядзька-кухар», «Дарэктар», «Начаткі», «Вечарамі», «Зіма ў Парэччы», «На рэчцы», «Таемныя гукі»), яны даўно трывала ўвайшлі ў кола дзіцячага чытання, а некаторыя сталі і хрэстаматыйнымі. Выдатны беларускі празаік і літаратуразнаўца І.Я. Навуменка называў «Новую зямлю» кнігай «аб бясхмарным дзяцінстве, аб адкрыцці дзяцінствам свету, такога цудоўнага, загадкавага і таямнічага» [2] і яшчэ: «Многія старонкі «кнігі прыроды», якую шырока разгортвае паэт, прачытаны менавіта дзецьмі, дапытлівым і цікаўным хлопчыкам Костусем. Гэта надае асаблівую цеплыню, шчырасць многім мясцінам паэмы» [2, с. 129].

У творы псіхалагічна дакладна вобразным словам узноўлены глыбока індывідуалізаваны ўнутраны свет дзяцей, асабліва Костуся, Алеся, Уладзіка, працэс іх вучобы, іх назіральнасць, імкненне самастойна пазнаць рэчаіснасць, невычарпальная паэтычная фантазія. А як каларытна, з цёплым гумарам выпісаны малалетні «дарэктар» (так у дарэвалюцыйнай Беларусі называлі адукаваных падлеткаў, якіх за невялікую плату наймалі настаўнікамі некаторыя сялянскія сем'і) – выхавацель і настаўнік Яська Базылёў, «з вузел ростам, у сваім уборы бедным простым, у зрэбных портках і кашулі»:

Ён толькі летась скончыў школку
І веды меў у адну столку,
Дый й тых патраціў з папавіну,
У поле гонячы скаціну...
[1, т. 6, с. 122]

Я. Колас падкрэслівае важную ролю народнай творчасці – і ў першую чаргу казкі, – прыроды, працы ў ідэйна-эстэтычным выхаванні дзяцей, у развіцці ў іх жывога ўяўлення. Успомнім хаця б раздзелы «На рэчцы», «Таемныя гукі», якія цудоўна перадаюць здзіўленне, зачараванне дзіцяці цудадзейнымі і разам з тым упаўне рэальнымі дзівамі прыроды. Хлопчык любіць слухаць пявучую гутарку інея з вадой, спевы і музыку вызваленай з-пад лёду вады, разглядаць на шыбах маляўнічыя карціны Мароза:

На шыбе ўсё: снапкі ржаныя,
Чароты хвацкія, буйныя,
І розных красак, траў нямала.
У душу летам патыхала...
[1, т. 6, с. 164]

Персаніфікацыя прыродных з'яў творча запазычана Коласам з фальклору. Гэта надае яго творам глыбока народную паэтычную прастату, выразнасць, міфалагічна-рамантычнае і адначасова зямное, праўдзівае гучанне. І ці можа дзіця застацца абыякавым да Марозу – пісара-вухара, самабытнага мастака, які

Узносіць слуп на неба роўны,
Высокі, вогненны, крывавы!
Той слуп – і страшны і цікавы –
Гарыць злавесна, ўвесь чырвоны.
Мароз на небе ставіць троны.
Вянцы на месяц укладае,

Па снезе зоркі рассыпае,
І так прыгожа, так старанна
Бярозе белай тчэ убранне...
[1, т. 6, с. 162]

Усё падуладна Марозу – і лес, і птушкі, і звяр'ё. «І на той час, як ён пануе, па небе хмарка не вандруе, і ўсе стварэнні занямеюць, і патыхаць вятры не смеюць...» [1, т. 6, с.162]. Не страшны ён толькі аднаму чалавеку, які адганяе яго працай.

І ў паэмах «Сымон-Музыка», «Новая зямля», і ў цэлым шэрагу вершаў Я. Колас па-майстэрску адлюстраваў жывапісную шматфарбнасць усіх пор года. «Прырода, – пісаў ён, – найцікавейшая кніга, якая разгорнута перад вачамі кожнага з нас. Чытаць гэту кнігу, умець адгадаць яе мнагалучныя напісы – хіба ж гэта не ёсць шчасце?» [1, т. 9, с. 13].

У аснове пейзажнай лірыкі Коласа ляжыць стагоддзямі апрабаваны фальклорны прынцып антрапамарфізму: нежывым істотам і з'явам прыроды надаюцца чалавечыя рысы і якасці. Персаніфікацыя прыроды, надзяленне яе фантастычнымі і тым не менш не пазбаўленымі сапраўднасці ўласцівасцямі, выкарыстанне рэальных і рамантычных, народна-паэтычных вобразаў – прыносяць ў вершы адценні таямнічасці, загадкавасці.

Коласу была дарага, блізка і цікава кожная пара года. Ён бачыў непаўторнае хараство, прыгажосць і зімы, і вясны, і лета, і восені. І ўсё гэта ярка, даходліва, займальна даносіў да дзіцяці. У многіх вершах паэт самымі простымі, будзённымі словамі стварыў сапраўды надзвычайна цудоўныя, жывапісныя карціны і малюнкі зімы з яе мяккімі пярынамі, што сваёю белізною вочы адбіраюць, з яе весялунамі-свавольнікамі вятрамі і маразамі, з закаванымі ў ледзяныя ланцугі рэчкамі і азёрамі... Паэтычна расказвае Колас аб ветравых дзецях – буйных віхурах, якія ходзяць вірам, «прасяваюць снег на сіта ў бясконцай шыры», па-маладзецку дурэюць і гуляюць, пакідаюць за сабою снежныя курганы («Мяцеліца»). З вялікай любоўю намаляваны і вобраз белабародага дзеда, які моцна «засцілае рэчкі лёдам», беражліва лёгкім пухам туліць дрэвы, клапатліва («крые руні, травы, лозы белай воўнаю – кажухам», шчодра сыпле на бярозы іней. І хаця імя яго не названа, дзеці лёгка здагадваюцца, што гэта дзед Мароз, і таму звонкай, шчырай песняй запрашаюць яго на Навагодняе свята) («Дзед-госць»).

Зіма нясе дзіцяці мноства паэтычных таямніц, загадак, якія яно імкнецца спасцігнуць, адгадаць. Маленькага Васілька з верша «На адзіноце» цікавяць і стогн-бурчанне ветру, і гудзенне мяцеліцы... Прычым паэт тонка спалучае пачуццёвае ўспрыманне прыроды з аналітычным. І вобразы зімы, мяцеліцы, марозу і г.д. усведамляюцца па выразных прыкметах.

Найчасцей Колас адлюстроўвае прыроду праз дзіцячае ўспрыманне. У класічным вершы «На рэчцы зімою» псіхалагічна глыбока і вобразна яскрава, пачуццёва перададзены дзівосная гармонія, адзінства паэтычнага хлопчыка Алеся з роднай прыродай. Аўтар дасканала ўзнавіў мастацкім словам жывое, непасрэднае дзіцячае светаўспрыманне, інтанацыю, самую манеру мыслення, свайго няўрымслівага героя. Колькі, напрыклад, цеплыні, шчырасці ў яго просьбе:

– Мамачка-галубка!
Просіць ён так міла,
Можа б ты на рэчку
Пагуляць пусціла?

– Я не буду доўга,
– Зараз жа вярнуся,
Трошачкі на рэчцы
Ў санках паважуся.
[1, т. 3, с. 145]

Тон верша інтымна задушэўны, народна меладычны, нават некалькі па-добраму «сентыментальны», сюжэт – дынамічны, рытм – дакладны, мова – выразная, экспрэсіўна сакавітая. Літаральна кожны радок звонкі, музыкальны, змацыянальны, змястоўна насычаны:

На рачулцы ў лесе
Меў Алесь забаву.
Ну ж і пацяшаўся
Хлопчык тут на славу!
- Эх ты, лёд-гвалтоўнік!
Што ты вытвараеш!
Ты нашто вадзіцу
Крыўдзіш і ўшчуваеш?
Бедненькай, ёй цёмна,
Цесна пад табою.
Хай жа пагамоніць
Мілая, са мною!
Дам ёй ход, галубцы.
Каб на свет зірнула! –
І яго сякерка
Спрытна секанула.
Звякае тапорык,
Глуха стук нясецца.
Раптам клуб вадзіцы
З-пада дна ўзаўецца.
Коціць поўзверх лёду,
Іней падымае
Ды такую ж казку,
Байку хлопцу бае!..

[1, т. 3, с. 146-147]

Самай простай, звычайнай лексікай Колас бліскуча перадаў і дзівосна ад-мысловую, чаруюча-прыгожую песню-казку вызваленай з-пад лёду-гвалтаўніка рачной вадзіцы, і гаму вялікіх, узвышаных, музыкальна-паэтычных пачуццяў, што ахапіла Алеся: «Слухае хлапчынка гэты сказ нязнаны, спеў, нікім ад веку ў лесе не чуваны. То яму здаецца дудак хор далёкі, то птушыны ў небе голас адзінокі..! [1, т. 3, с. 147].

Колас услаўляе сонца, вясну, лета – жыватворныя сілы жыцця. І яны так-сама адухаўляюцца, персаніфікуюцца. Паэт размаўляе з імі як з жывымі субя-седнікамі. Проста немагчыма пакінуць па-за ўвагай незвычайна прывабны верш «Песня аб вясне», у якім так і чуецца бадзёрае, здаровае дыханне ма-ладой вясны, што шчодра адорвае ўсё наваколле цеплынёй, ласкай, дабра-той, вяселлем, святлом:

Уцякай, мароз-дзядуля!
Чуеш ты, стары, ці не?
На пагорках – булі-гулі! –
Песні чуюцца вясне.
Звоніць, скача, як дзіцятка,
Гэты жэўжык-ручаёк.
На яго, бы тая матка,
Сонца кідае свой зрок.
А ён, гучны і смяшлівы,
Так і ходзіць, аж дрыжыць,
І другі сябрук шчаслівы
Насустрэч яму бяжыць...

[1, т. 3, с. 159]

Хто толькі з паэтаў не пісаў аб веснавых і летніх ручаях? Вобразы іх часта сустракаюцца і ў творчасці Коласа. І кожны – непаўторны, заўсёды ўспрыма-ецца свежа, па-новаму. Чароўныя песні, звонкія, радасныя трэлі срэбразвон-нага ручайка яскрава гучаць у вершы «Ручэй»:

Часам зорка ўначы
На яго кіне зрок,
І хмурынка не раз
Зазірне ў ручаёк.
І схіляе трава
То заскочыць у гай,
То курган абаўе,
Дзе сярдзіта бубніць,
Дзе лагодна пяе.
Люба слухаць той спеў,

Над ім пасмы-брыжы,
А ён, жэўжык-пястун,
Гучным смехам дрыжыць.

Несціханы, густы,
І пад песні яго
Адпачынеш і ты.
[1, т. 1, с. 169]

Апісанне ручая зрокава яркае, дынамічнае; так і адчуваеш яго няўрымслівасць, імклівы бег. Твор зачароўвае і сваёй асаблівай эўфанічнасцю, меладычнасцю паэтычнай інтанацыі, і глыбока інтуітыўнай, унутранай народнасцю радка / «Між алешын, кустоў, дзе пяе салавей, і шуміць і грыміць срэбразвонны ручэй. Як матулька, вярба хіліць голаў над ім, і глядзяцца кусты пышным верхам сваім...». [1, т. 1, с. 169].

Я. Колас добра разумеў цягу дзіцяці да ўсяго яркага, узвышанага, рамантычнага, таму што спрадвеку ружовае, аптымістычнае ўспрыманне свету – неад'емная прынапежнасць дзяцінства. Паэтычны слоўнік, танальнасць, рытміка яго твораў поўнасцю абумоўлены іх тэматыкай, асаблівасцямі светаадчування і светаўспрымання дзіцяці. А таму лірыка Коласа напоўнена звонкімі, светлымі гукамі, бадзёрымі, жыццерадаснымі інтанацыямі.

Цудоўная карціна роднай прыроды створана ў вершы «На полі вясною». Чытаеш яго – і чуеш музыку і дрыжанне ветрыка, што «жартліва плыве збажынаю», калыханне і шэпт жыта, вобраз якога ўдала імітаваны гукамі «ж», «ш». І гукапіс гэты здзіўляе сваёй натуральнасцю, меладычнасцю: «Калышацца жыта, радамі бяжыць, а хваля паветра дрыжыць і дрыжыць...» [1, т. 1, с. 76-77]. Дзівосная прыгажосць гукавой паліфаніі і страфы, у якой перададзены «голас» ручая: «Люблю я дарогі, што леглі між гор, ўнізе пад гарою ручча разгавор» [1, т. 1, с. 76].

Змест большасці пейзажных вершаў Коласа проста цяжка пераказаць, бо яны пабудаваны на глыбока напружанай унутранай энергіі. Паэт вельмі ўважліва, патрабавальна падыходзіў да напісання твораў, адрасаваных дзецям, кожнае слова вывяраючы на гучнасць, колер, густ. І ў выніку пад яго пяром спяваюць ручаі, абуджаецца гай, птушыным свістам напаўняецца лес, «і першы гром, як музыка», таямніча пракочваецца... («Вясна»).

Чарадзейнае коласаўскае слова даносіць да дзіцяці дзівосную мапяўнічую карціну ночы перад навальніцай. Паэт дае трапнае, дакладнае і разам з тым экспрэсіўна казачнае апісанне летняй ночы – таго часу, калі на небе з'яўляецца кругпаліцы месяц, «крыжуюцца зарніцы, бы косяць небасенажаць». Замаўкае голас працоўных дзённых клопатаў, нават на дрэве не дрыжыць ліст і толькі «на ніве чутка дрэмле колас». І раптам у гэту казачную цішу ўрываецца гром, яго непаўторная, уладарная, перапіўная музыка:

Люблю я ночы той час дзіўны,
Калі прастор, абняты сном,
Пабудзіць голас перапіўны –
Далёкіх хмар магутны гром,
Капі працягла заракоча,
Гугухне голас угары,
І шыба ў вокнах забразгоча,
І гоман пойдзе па бары.
А хмара грозна націскае,
Мапанка неба баразніць.
А ночка спіць, а ноч не знае,
Што зараз бура зашуміць.
[1, т. 1, с. 210]

Цудадзейная сімфонія гукаў навальніцы і ў вершы «Першы гром», у якім з тонкім пачуццём меры створаны выразны малюнак навакольнага сугалосся:

Голасам моцы, ціха і важна
Гром пракаціўся ўгары.
Луг адазваўся грому працяжна,
Лес адгукнуўся стары...
[1, т. 1, с. 204]

Твор гэты вылучаецца веліччу, сілай, вобразнай выразнасцю роднага слова, якое па-майстэрску імітуе малюнак першага грому. Музыка і сэнс у вершы зліліся ў непарыўнае адзінае. Я. Колас бліскуча перадаў і нарастанне грому, і яго рокат – кульмінацыйны момант, – адгалоскі, паступовае зацішша. І важную ролю ў гэтым адыграла гукавая паліфанія, якая глыбока інтуітыўная, прадыктаваная самой тэмай твора. Напоўнены музыкай жывых народных слоў, якія малююць непаўторную карціну першага грому, верш не толькі зачароўвае маленькіх прыгажосцю роднай прыроды, але і абуджае ў іх сэрцах паэтычнае натхненне, прыносіць дзіцяці эстэтычную асалоду.

Да таго ж пейзажная лірыка Коласа глыбока філасофская, але гэта яе ярка выяўленая філасофская накіраванасць, як правіла, эмацыянальная, у меру даходлівая. Возьмем хоць бы верш «Дуб», які таксама прываблівае асаблівай напеўнасцю, меладычнасцю, моцнай сувяззю з народным мысленнем, з традыцыйнай фальклорнай паэтыкай:

Сілачом стаіць
Дуб разложысты,
І здалёк відаць
Пышны верх яго.
А ўнізе лад ім
Нёман коціцца,
Срэбрам-стужкаю
Павіваецца.

У нагах трава
Нізка сцелецца,
А вакол ляжыць
Травяністы луг.
Ў глыб зямлі ўвайшлі
Карані яго.
Крэпка дуб стаіць,
Не варушыцца!
[1, т. 1, с. 211]

Маленькае дзіця твор гэты захапляе сваёй музыкай, рамантычна маляўнічым апісаннем прыроды. Падрастаючы ж мы адкрываем у ім і глыбіню думкі, спасцігаем яго багатую сімволіку – той чалавек, які моцна любіць свой край, сваю Радзіму, трывала ўвабраў у сябе ўсё роднае, не сагнецца перад нягодамі, цяжкасцямі, як не гнецца перад бураю дуб, учэпіста ўпусціўшы ў глыб роднай зямлі свае карані...

Многія вершы Коласа напоўнены радаснымі, сонечнымі летнімі фарбамі, колерамі, гукамі, шорахамі, пахамі («Усход сонца», «Летам», «На лузе», «Лес»). І зусім іншыя малюнкі, іншае гучанне, іншыя пачуцці і настроі выклікае надыход восені, калі вольныя птушкі, адлятаючы ў цёплыя мясціны, нясуць «за сабою лета» («Гусі»). Выразная карціна восені адлюстравана ў вершы «Адлёт жураўлёў». Адпаведна змрочнаму пейзажу, сціхнуўшаму лесу, сэрцу робіцца смутна і тужліва. З адыходам лета «заціхаюць далі, сіраcее рэчка, халадзеюць хвалі». Усё рыхтуецца да доўгага зімовага адпачынку. Але што гэта за гукі, жаласныя і прыгожыя, чуюцца ў прасторы, зачароўваючы лясы, луг, балота? Гэта

У бязмежным небе
Роўненькім шнурочкам
Жураўлі на вырай
Мкнуцца над лясочкам.

Меншыцца шнурочак,
У паднеб'і тае,
Вось ледзь-ледзь чарнее,
Міг – і прападае.
[1, т. 1, с. 135-136]

Аб самабытнай музыкальнасці пейзажнай лірыкі Коласа яшчэ ў дваццатыя гады добра сказаў вядомы музыказнаўца Ю. Дрэйзін, параўноўваючы нашага песняра з Шубертам, у якога «прырода таксама злучапася з музыкай і кожны вобраз прыроды знаходзіў сваё музычнае адбіццё...» [3]. Дрэйзін трапна заўважыў, што прырода ў адлюстраванні Коласа «нават у ціхую ноч, калі ўсюды пануе цішыня, не гамоніць лес, не шуміць вецер, заснулі птушкі – нават і тады... пяе, бо і цішыня мае свой голас, сваю музыку... Існуе нейкае злучэнне, супольнасць паміж гукамі перуноў і нямою цішай» [3, с. 142].

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Колас Якуб***. Збор твораў: У 14 тамах. Мн., 1972-1978. Т. 13. С. 20. (У далейшым спасылкі на гэта выданне падаюцца скарочана – у дужках том і адпаведная старонка).
2. ***Навуменка І.Я.*** Якуб Колас. Духоўны воблік героя. Мн., 1981. С. 124.
3. ***Дрэйзін Ю.*** Музыка ў творах беларускіх паэтаў // Полымя, 1925, № 6. С. 143.



## SUMMARY

*The article deals with Yakub Kolas's works of literature for children. The author managed to reveal their peculiarities such as lyrism, polyphony, novelty in depicting of nature and richness of colours.*

*The author mentions the significant role of these works in children's esthetic upbringing.*


*Поступила в редакцию 29.01.2002*